# У супрацоўніцтве з заказчыкамі кадраў і УВА

**Сучасны стан і перспектывы развіцця ваенна-патрыятычных класаў мытнай накіраванасці былі абмеркаваны на круглым стале, які адбыўся на факультэце міжнародных адносін БДУ.**

Мерапрыемства аб'яднала прадстаўнікоў Дзяржаўнага мытнага камітэта Рэспублікі Беларусь, кіраўнікоў школ і гімназій краіны, на базе якіх дзейнічаюць класы і групы мытнай накіраванасці, супрацоўнікаў профільных кафедр устаноў вышэйшай адукацыі.



Падчас круглага стала былі абмеркаваны пытанні ўзаемадзеяння мытных органаў, профільных кафедр УВА з класамі мытнай накіраванасці, вопыт планавання і рэалізацыі вучэбнай і выхаваўчай работы вы ўстановах адукацыі, шляхі яе ўдасканалення, сучасны стан вучэбна-метадычнага забеспячэння адукацыйнага працэсу ў такіх класах і інш.

> На сёння ў краіне дзейнічаюць 49 ваенна-патрыятычных класаў і груп мытнай накіраванасці ў 14 установах агульнай сярэдняй адукацыі. Дарэчы, колькасць такіх класаў з году ў год павялічваецца. У іх вучацца 1112 навучэнцаў (у мінулым годзе — 782). Найбольшая колькасць мытных класаў адкрыта ў Мінскай і Гомельскай абласцях (14 і 9 адпаведна).

У гэтым годзе з 81 выпускніка такіх класаў і груп паступілі ва УВА па профілі 12 школьнікаў, што складае 14,8%.

На думку намесніка начальніка ўпраўлення кадраў і ідэалагічнай работы ДМК Рэспублікі Беларусь Дзмітрыя Харачынскага, эфектыўнасць такой прафарыентацыйнай работы неабходна павышаць, аб'яднаўшы намаганні школ і гімназій, дзе створаны мытныя класы, УВА і заказчыкаў кадраў.

Як адзначалася, з 1 верасня 2024 года для навучэнцаў ваенна-патрыятычных класаў мытнай накіраванасці арганізоўваюцца факультатыўныя заняткі "Гатовы Радзіме служыць!". У праграме факультатыву, зацверджанага Міністэрствам адукацыі, распрацаваны вучэбны модуль "Будучы мытнік", у межах якога навучэнцы знаёмяцца з тэрмінамі, якія прымяняюцца ў мытных органах, гісторыяй зараджэння і развіцця мытнай справы на беларускіх землях, з парадкам і ўмовамі праходжання службы ў мытных органах, з мытнай кіналогіяй, інфармацыйнымі тэхналогіямі ў названай сферы і інш. Зараз ствараецца вучэбна-метадычнае забеспячэнне факультатыўнага курса. Рыхтуецца да выдання вучэбны дапаможнік "Кніга будучага мытніка".

Вопытам дзейнасці ваенна-патрыятычных класаў мытнай накіраванасці падзяліліся намеснік дырэктара сярэдняй школы № 13 імя У.Ц.Цаба Гродна Мікалай Падручны і дырэктар сярэдняй школы № 18 імя Еўфрасінні Полацкай Полацка Канстанцін Шухлеў.



З 2021 года ў 18-й полацкай школе пачалі дзейнічаць групы мытнай накіраванасці. Галоўная іх мэта — матывацыя навучэнцаў на паступленне ва УВА Рэспублікі Беларусь. Штогод 10—12 навучэнцаў выказваюць жаданне вучыцца ў такім класе. Пачынаючы з 10 класа школьнікі вывучаюць профільныя прадметы: матэматыку і англійскую мову, якія з'яўляюцца неад'емнымі ў мытнай сферы. Быў падпісаны дагавор аб супрацоўніцтве паміж Віцебскай мытняй, Полацкім дзяржаўным універсітэтам імя Е.Полацкай і школай, у межах якога штогод складаецца праграма ўзаемадзеяння. Яна прадугледжвае як адукацыйныя практыка-арыентаваныя мерапрыемствы (напрыклад, вучні знаёмяцца з работай Наваполацкага мытнага паста), так і спартыўныя, культурна-масавыя мерапрыемствы. Выкладчыкі ўніверсітэта чытаюць лекцыі, праводзяць практычныя заняткі ў межах факультатыўнага курса. Шматлікія сустрэчы з прадстаўнікамі мытні, экскурсіі ва ўніверсітэт і пункты пропуску забяспечваюць школьнікаў неабходнымі навыкамі для асваення прафесіі. Дзякуючы такому ўзаемадзеянню, навучэнцы яшчэ да паступлення становяцца бліжэй да мытнай справы.

Каля 50% выпускнікоў школы штогод выбіраюць спецыяльнасці, звязаныя з мытнай справай. Летась 6 навучэнцаў з мытнай групы паступілі па мэтавых накіраваннях у Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт, БелДУТ, а сёлета з 11 навучэнцаў 5 сталі студэнтамі. У наступным годзе выпускаюцца 12 навучэнцаў, з іх 7 плануюць паступаць па профілі.

— Мы арыентуем дзяцей на мэтавае паступленне, каб яны былі ўпэўнены, што пасля завяршэння навучання ў іх будзе гарантаванае рабочае месца, — адзначыў Канстанцін Шухлеў.

Дырэктар 18-й школы агучыў і праблемы, звязаныя з функцыянаваннем класаў і груп мытнай накіраванасці. Сярод іх — адсутнасць механізма паступлення выпускнікоў такіх класаў на льготных умовах ва ўстановы вышэйшай адукацыі, як гэта зроблена для выпускнікоў педагагічных, аграрных класаў; гендарны дысбаланс (сёння на спецыяльнасці, звязаныя з мытнай справай, паступаюць пераважна дзяўчаты); адсутнасць алгарытму выдачы мэтавых накіраванняў навучэнцам мытнай групы альбо класа.

Загадчык кафедры мытнай справы і міжнароднай лагістыкі ФМА БДУ Віктар Астрога спыніўся на рэалізацыі адзінага плана мерапрыемстваў для ўстаноў адукацыі, у якіх дзейнічаюць класы мытнай накіраванасці. У межах плана сёлета былі праведзены дзясяткі мерапрыемстваў (форумы, фестывалі, агляды-конкурсы, квесты і інш.), якія далі ўстановам адукацыі магчымасць праявіць сябе, падзяліцца вопытам, наладзіць цеснае ўзаемадзеянне.

Пры стварэнні плана на наступны год, на думку В.Астрогі, неабходна ўлічыць унікальнасць і спецыфіку кожнай установы адукацыі, паказаць тое, што атрымліваецца ў яе лепш за ўсё; прапанаваць больш мерапрыемстваў па тэматыцы мытнай справы; чаргаваць месцы правядзення мерапрыемстваў, каб прадэманстраваць, што служыць можна не толькі ў родным горадзе. Для больш эфектыўнай прафарыентацыі было вырашана працягнуць работу па забеспячэнні форменным адзеннем мытных класаў, а таксама прадумаць сістэму ўзнагарод для школьнікаў (за паспяховую вучобу, за дасягненні ў той ці іншай галіне і г.д.)

Педагогі ўнеслі і некаторыя прапановы наконт дзейнасці ваенна-патрыятычных класаў мытнай накіраванасці. У прыватнасці, гаварылася пра тое, каб арганізаваць летам ваенна-палявыя зборы для навучэнцаў такіх класаў з удзелам УВА і Дзяржаўнага мытнага камітэта, распрацаваць унутрыўніверсітэцкую алімпіяду для мытных факультэтаў УВА, стварыць настольную гульню для навучэнцаў ваенна-патрыятычных класаў мытнай накіраванасці.

Удзельнікі мерапрыемства азнаёміліся з выставай літаратуры грамадзянска-патрыятычнай тэматыкі для арганізацыі работы ў ваенна-патрыятычных класах. Таксама прысутныя сталі сведкамі плац-параду студэнтаў групы Ганаровага каравула кафедры мытнай справы і міжнароднай лагістыкі ФМА БДУ.